# ХТО СТАНЕ «СТУДЭНТАМ ГОДА — 2020»?

## Вызначыліся фіналісты рэспубліканскага конкурсу

**Да гэтага адбыліся абласныя і Мінскі гарадскі этапы. Для ўдзельнікаў былі падрыхтаваны разнастайныя конкурсныя выпрабаванні, дзе яны маглі праявіць свой артыстызм, аратарскае майстэрства, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці. Выпрабаванні прайшлі як у вочным, так і завочным фармаце. У выніку вызначана 11 фіналістаў — чатыры юнакі і сем дзяўчат, якія прымуць удзел у рэспубліканскім фінале, паведамілі ў ЦК БРСМ.**




Фота з сайта БРСМ

Так, Брэсцкую вобласць у ім будзе прадстаўляць студэнт трэцяга курса гістарычнага факультэта БрДУ імя А. С. Пушкіна Уладзіслаў Макарэвіч. Малады чалавек лічыць, што дзякуючы падтрымцы сяброў і блізкіх людзей яму ўдалося дастойна выступіць і заняць першае месца на абласным этапе. Акрамя звання «Студэнт года», ён таксама заваяваў тытул «Студэнт online».

Гонар Віцебскага рэгіёна будзе адстойваць студэнт трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Уладзіслаў Міроннчык. Малады чалавек актыўна прымае ўдзел у праектах Саюза моладзі і ўніверсітэта, розных творчых калектываў.

Ад Гомельскай вобласці ў фінальных спаборніцтвах пазмагаецца студэнтка чацвёртага курса факультэта кіравання працэсамі перавозак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Дар'я Гелец. Дзяўчына — актыўная ўдзельніца і арганізатар канцэртаў і конкурсаў, з'яўляецца аўтарам трох навуковых работ.

Студэнтка пятага курса лячэбнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Анастасія Хлюпіна таксама пазмагаецца за званне «Студэнт года — 2020». Яна з'яўляецца валанцёрам атрада «Добрае сэрца ГрДМУ», а таксама інструктарам па першай дапамозе атрада хуткага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Магілёўскую вобласць у фінале будуць прадстаўляць дзве ўдзельніцы — гэта студэнтка трэцяга курса факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Лізавета Дуброўская і студэнтка трэцяга курса інжынерна-эканамічнага факультэта Беларуска-расійскага ўніверсітэта Арына Сафонава. Дзяўчаты дзякуючы конкурсу «Студэнт года» хочуць рэалізаваць свой патэнцыял і адкрыць новыя таленты і здольнасці.

Курсант трэцяга курса факультэта падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў Інстытута пагранічнай службы Уладзіслаў Федзюковіч таксама прайшоў у фінал. Хлопец абраў прафесію пагранічніка невыпадкова — Улад марыць гэтак жа, як і яго бацька, служыць на пагранічнай заставе. Абсалютна ўпэўненая ў сваіх сілах курсант другога курса факультэта тэхнасфернай бяспекі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Кацярына Рудовіч. Дзяўчына — прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў па веславанні на байдарках і каноэ, пастаянны ўдзельнік вакальных конкурсаў і навукова-практычных канферэнцый.

Мінск на рэспубліканскім этапе прадставяць студэнтка другога курса факультэта маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Алена Мятлушка і студэнтка другога курса Інстытута кіраўнічых кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Ксенія Брыкун. Алена вельмі любіць музыку, а таксама міні-футбол. Галоўныя жыццёвыя прынцыпы Ксеніі — імкнуцца да дасканаласці, ісці толькі наперад і кіраваць сваёй будучыняй. Канкурэнцыю дзяўчатам у фінале таксама складзе курсант трэцяга курса ваеннага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Кірыл Гіро — чэмпіён Узброеных Сіл па вайсковым рукапашным баі 2019—2020 гадоў.

У конкурсе «Студэнт года» спаборнічаюць студэнты дзённай формы навучання ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гэта маладыя людзі, якія вядуць актыўнае навуковае, творчае, спартыўнае, грамадскае жыццё і маюць сярэдні бал па выніках апошніх двух семестраў не менш як «8». Рэспубліканскі фінал плануецца правесці ў пачатку снежня, калі і стане вядома імя «Студэнта года — 2020».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рэпазіторый ГрДМУ